Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-02-07



# Настаўнік

## 26 лютага споўніцца 95 гадоў з

**Калі ўзгадаць кіраўнікоў Беларускай ССР перыяду 1919—1991 гадоў, то па такіх крытэрыях, як папулярнасць, аўтарытэт і ўсенародная любоў, на першым месцы, несумненна, будзе Пётр Міронавіч Машэраў. Гэты чалавек увайшоў у гісторыю нашай краіны як народны герой, як выдатны партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў патрыятычнага падполля і партызанскага руху ў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, удастоены дзвюх Залатых Зорак — Героя Савецкага Саюза і Героя Сацыялістычнай Працы. Ніхто — ні да, ні пасля Машэрава так доўга не ўзначальваў партыйную арганізацыю рэспублікі — цэлых пятнаццаць з паловай гадоў (1965—1980).**



### Дзяцінства і юнацтва

Жыццёвы шлях Пятра Машэрава пачаўся 13 (26) лютага 1918 года. Ён нарадзіўся ў вёсцы Шыркі Сенненскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і беднякоў — Мірона Васільевіча Машэрава і Дар'і Пятроўны Ляхоўскай (Машэравай). Імя Пётр яму далі ў гонар бацькі матулі. Калі немаўля хрысцілі, бацюшка шматзначна прамовіў: "Божай міласцю стане вялікім чалавекам".

Пётр Машэраў быў выхадцам з народных глыбінь. З дзяцінства яму запомнілася нялёгкая праца пастушка, вучоба ў пачатковай школе, пастаянная дапамога бацькам у іх цяжкай працы. Разам з тым Пётр горача, па-юнацку быў улюбёны ў родныя мясціны. У сям'і Машэравых з васьмі народжаных дзяцей у жывых засталося пяцёра: тры дзяўчынкі (Матрона, Вольга і Надзя) і два хлопчыкі (Павел і Пётр).

Старэйшы брат Павел вучыўся ў Бугаеўскай сямігодцы, за дзесяць кіламетраў ад дому, а Пятра вырашылі ўладкаваць бліжэй, у Машканскую няпоўную сярэднюю школу. Хадзіў туды хлопчык адзін. Бацька змайстраваў яму лыжы, на якіх ён прабягаў туды і назад 18 кіламетраў у дзень. Так ужо атрымалася, што ў хуткасці на каньках і лыжах Пятру Машэраву не было роўных. І гэтая імклівасць, лёгкасць у рухах засталіся на ўсё жыццё.

У фондах Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны захоўваецца магнітафонная касета з запісам успамінаў старэйшага брата П.М.Машэрава — Паўла Міронавіча. Прывядзём урывак з гэтых успамінаў: "Як мне ўдалося прывіць любоў Пятра да прафесіі настаўніка? Тут не толькі мая роля. Вялікае ўздзеянне аказалі многія школы, дзе ён вучыўся. У шосты клас ён пайшоў у Машканскую сямігадовую школу Віцебскага раёна. Там яму вельмі спадабаўся выкладчык матэматыкі — прозвішча не помню. Відаць, быў і яго ўплыў. Пасля заканчэння педагагічнага вучылішча я атрымаў накіраванне ў школу ў вёсцы Дворышчы Расонскага раёна. Прапанаваў Пятру ехаць са мной: маўляў, я буду працаваць у школе, а ты будзеш вучыцца ў сёмым класе, таму што Машканы далёка, за 8 кіламетраў ад дому. Туды вельмі цяжка дабірацца, асабліва зімой і восенню. Праўда, Пётр змайстраваў лыжы і хадзіў на іх у школу. Ён з дзяцінства любіў катацца на самаробных каньках. Пётр пагадзіўся. Настаўнік матэматыкі Аляксандр Андрэевіч Валковіч, ён жа дырэктар школы, перадаў яму любоў да матэматыкі і фізікі. Ён выконваў не толькі тыя заданні, якія задаваліся на дом, але і дадатковыя.

Калі ў 1934 годзе, пасля заканчэння сямі класаў, паўстала пытанне аб выбары навучальнай установы, Пётр сказаў: "Ведаеш, Павел, падчас вучобы ў Машканскай і Дварышчанскай школах спадабалася прафесія настаўніка...". Дамовіліся, што ён будзе паступаць у Віцебскае педагагічнае вучылішча (раней педтэхнікум). Хутка Пётр вярнуўся адтуль і гаворыць: "Падаў заяву на педагагічны рабфак. Ён у будынку вучылішча знаходзіцца". — "Як — рабфак? — пытаюся. — Каб паступіць туды, трэба мець накіраванне ад арганізацыі, дзе працуеш, падаць станоўчую характарыстыку". — "А я на летніх канікулах добра папрацую ў калгасе. І мне дадуць патрэбныя дакументы. Заадно да экзаменаў падрыхтуюся на апошні курс рабфака, каб праз год паступіць у undefinedпедінстытут".

Усё лета брат працаваў у гаспадарцы: касіў, сушыў сена, выконваў іншыя сельскагаспадарчыя работы. Так старанна гэта рабіў, што дарослыя здзіўляліся, гаварылі мне: "Пётр — школьнік, а не ўступае нам у працы". Адначасова ён настойліва рыхтаваўся да ўступных экзаменаў. Я даваў парады. Падказваў, якую выкарыстоўваць літаратуру. Паспяхова скончыўшы рабфак, праз год брат ужо вучыўся ў Віцебскім педінстытуце імя С.М.Кірава. Па часе выйграў два гады. Вельмі быў задаволены, што паступіў на фізіка-матэматычны факультэт...".

Падчас вучобы ў гэтай ВНУ з юнаком здарылася бяда. У снежні 1937 года, ноччу, да хаты Машэравых пад'ехала чорная крытая машына (у народзе яе называлі "чорны воран"). У дом зайшлі незнаёмыя людзі ў форме НКУС і адразу звярнуліся да Мірона Васільевіча Машэрава: "Збірайся!". Нічога не патлумачыўшы ні жонцы, ні дзецям і не даўшы сказаць ні слова, яго забралі.

Крыху пазней, запаўняючы асабовы лісток па ўліку кадраў, у звестках аб бацьках, Пётр Машэраў напіша: "Бацька... узяты органамі НКУС, асуджаны на тры гады і памёр 6 сакавіка 1938 года адбываючы пакаранне".

У 1939 годзе Пётр Машэраў скончыў аддзяленне фізікі фізмата Віцебскага педінстытута імя С.М.Кірава. Павел Міронавіч Машэраў успамінаў: "Пасля заканчэння педінстытута ў 1939 годзе Пётр прыехаў на канікулы. Ён ужо быў камсамольцам...

У той час я працаваў інспектарам раённага аддзялення народнай адукацыі. Далі Пятру накіраванне ў Расонскую сярэднюю школу (цяпер яна носіць імя Машэрава), дзе ён будзе выкладаць матэматыку і фізіку навучэнцам старшых класаў. Праз нейкі час брат нечакана заяўляе: "Наладжу фізічны кабінет, які б не ўступаў аналагічным кабінетам школ Віцебска".

Навучэнцы сярэдняй школы вельмі любілі займацца ў фізічным кабінеце. А Пётр як выкладчык фізікі гэтым карыстаўся ўмела. Увесь свабодны час у кабінеце яны пілавалі, стругалі, клеілі, свідравалі, паялі і малявалі. Для старшакласнікаў ён потым арганізаваў фотагурток і гурток астраноміі. "Ці да зорак нам, Пётр Міронавіч? — здзіўляліся спачатку яго выхаванцы. — На зямлі хапае клопату!" — "Чалавек павінен імкнуцца спасцігнуць таямніцы Сусвету. "Калі зоркі запальваюцца, значыць, гэта камусьці патрэбна", — працытаваў ён свайго любімага паэта Маякоўскага.

Знешне спакойны, тактоўны, ён умеў стрымліваць свае пачуцці. Пётр быў спагадлівым чалавекам, ненавідзеў раўнадушша. Школьнікі цягнуліся да яго, таму што ведалі: што б у іх жыцці ні здарылася, малады настаўнік успрыме перажыванні школьнікаў як свае, зразумее і дапаможа разабрацца".

А вось што ўспамінаў у лютым 1973 года сам Пётр Міронавіч аб першым годзе сваёй работы ў Расонскай сярэдняй школе:

"Мой першы выпуск... Прыслалі пісьмовыя работы па матэматыцы. Іх павінны былі выдаць на наступны дзень, за дзве гадзіны да экзаменаў. Павел тады працаваў у райана і прапанаваў:

— Можа, хочаш паглядзець кантрольныя?

Я пытаюся:

— А парадак які?

— Па правілах — заўтра выдадуць.

— А як ты думаеш, вельмі складаныя?

— Вельмі, — адказаў брат.

— Не, не буду глядзець.

Перад экзаменам дырэктар даў для 10 класа канверт — па трыганаметрыі. Задачы элементарна простыя. Падумаў: як жа быць? У класе ёсць двоечнікі, у іх за ўвесь год па ўсіх чвэрцях двойкі. Аднак адчуваю, што нават яны гэтыя задачы рэшаць. І сапраўды, чацвёра з непаспяваючых справіліся з задачамі. Праз дзень паведамілі, што ў Клясціцкай школе ніхто не рашыў, нават сам настаўнік зрабіў заключэнне, што ўмовы няправільныя. Ці такі выпадак. Даў неяк на дом заданне. Ноч прасядзеў і не рашыў. Ніхто з навучэнцаў таксама з заданнем не справіўся. У падручніку Рыбкіна большасць задач — з "зорачкамі". І ўсё ж рашылі задачу. Не хапіла ўрока, занялі наступны — фізіку. І справіліся.

Затое магу пахваліцца. З Расонскай школы мае навучэнцы паступалі ў Ленінградскія інстытуты, у асноўным тэхнічныя. (Да Ленінграда было лягчэй дабірацца, чым да Віцебска.) Ніводзін навучэнец не праваліўся. За два гады не было выпадку, каб не паступілі, нават пры конкурсах. Вось якія малайцы! Я да чаго вяду размову? Патрэбен добры настаўнік, які ўмее добра вучыць. Дзеці здольныя. Могуць авалодаць вельмі складанымі пытаннямі! Усім навучэнцам цяжэй за ўсё даецца матэматыка. Але нават тых, для каго яна найбольш цяжкая, можна навучыць. Я вёў матэматыку з дзявятага класа, а калі б з сёмага?! Якіх бы таленавітых навучэнцаў выхаваў!".

У гутарцы з найбліжэйшым саратнікам П.М.Машэрава — былым другім сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі, Старшынёй Савета Міністраў БССР А.Н.Аксёнавым, я пачуў ад яго такія словы: "Многія партыйныя работнікі за вочы называлі Пятра Міронавіча "вялікім настаўнікам" ці "настаўнікам з вялікай літары".

Будучы яшчэ студэнтам гістарычнага факультэта, аўтар гэтых радкоў у 1959—1960 гадах, выконваючы грамадскае даручэнне — агітатара на выбарах, аказаўся ў кватэры сакратара ЦК КПБ П.М.Машэрава і сустракаўся з яго жонкай Палінай Андрэеўнай. Яна адзначыла, што ўжо са школьных гадоў у Пятра Міронавіча выпрацоўваўся характар, галоўнай рысай якога была настойлівасць у дасягненні мэты. Ён быў вельмі мэтанакіраваным і ніколі не адступаў, не вырашыўшы таго ці іншага пытання. Будучы ўжо на адказнай партыйнай рабоце, Машэраў стараўся заставацца выхавальнікам, педагогам. "Такая прафесія настаўніка, — гаварыў Пётр Міронавіч, — умела, тонка выхоўваць людзей, рабіць іх добрымі, абуджаць у іх высакародныя пачуцці".

### Вайна

Улюбёны ў сваю справу педагог Машэраў меў светлыя мары: здача экзаменаў у аспірантуру, цікавая навуковая работа. Але ўсе планы маладога настаўніка Пятра Машэрава перакрэсліла вайна. І вось замест заявы ў аспірантуру ён нясе ў ваенкамат заяву з просьбай накіраваць яго на фронт. Яму адмаўляюць, як і многім іншым. Але хутка ў Расонах з некалькіх соцень добраахвотнікаў ствараецца знішчальны батальён — сюды і накіравалі Пятра Машэрава.

Доўгія гады ў афіцыйных матэрыялах і шматлікіх публікацыях аб жыцці і дзейнасці Пятра Машэрава нічога не гаварылася аб яго знаходжанні ў палоне. Мы ж закранем гэтую "далікатную" тэму.

Справа была такая. Амаль бяззбройныя расонскія добраахвотнікі са знішчальнага батальёна разам з часцямі Чырвонай Арміі, якія адступалі, адыходзілі на ўсход. Аднак праз тры дні, 24 ліпеня 1941 года, пры пераходзе ў раёне Невеля Ленінградскай шашы, густа забітай нямецкімі войскамі, кола акружэння замкнулася. У раёне мястэчка Пусташкі Калінінскай вобласці Пётр Машэраў з групай байцоў трапіў у палон.

Глухой ноччу 28 ліпеня Пятру Машэраву ўдалося ўцячы з палону. Такім чынам, ён быў у палоне... усяго чатыры дні.

...5 жніўня 1941 года Пётр Машэраў дабраўся да бацькоўскай хаты ў Расонах, якія былі заняты немцамі. Ён уладкаваўся працаваць рахункаводам у нераспушчаны калгас "Расоны" і настаўнічаў у школе.

Асвоіўшыся ў новай сітуацыі, Пётр Машэраў арганізоўвае ў Расонах камсамольска-маладзёжнае падполле, галоўным чынам са сваіх выпускнікоў і настаўнікаў. Хутка Машэраў сустрэўся з сакратаром Расонскага падпольнага райкама партыі Варфаламеем Лапенкам, якога пакінулі для работы ў тыле ворага. Выконваючы яго ўказанні, Дубняк (*падпольная мянушка Пятра Машэрава.* — **Э.І.**) смела наладжваў сувязь з падпольнымі групамі, якія дзейнічалі ў Альбрэхтаве, Клясціцах, Саколішчах, Юхавічах, Роўным Полі, Мілавідаве і іншых населеных пунктах Расонскага раёна.

Сярод актывістаў камсамольска-маладзёжнага падполля была і Паліна Андрэеўна Галанава — па прафесіі зубны ўрач. Працуючы ў шпіталі, яна пры адступленні трапіла ў палон, а потым па дарозе ў Полацк уцякла. З ёй і звязаў свой лёс Пётр Машэраў.

Вясной 1942 года гестапа напала на след падпольшчыкаў, якія даведаліся аб гэтым. І тады па сігнале Машэрава 19 красавіка 1942 года падпольшчыкі пакінулі Расоны. Іх было 15 чалавек, у асноўным старшакласнікі Расонскай і Клясціцкай сярэдніх школ. Так у Расонскім раёне з удзельнікаў патрыятычнага падполля быў створаны партызанскі атрад на чале з Пятром Машэравым. Да ліпеня 1942 года ён дзейнічаў самастойна і называўся атрадам Дубняка.

Хутка атрад Дубняка ўліўся ў склад брыгады "За Савецкую Беларусь". Потым быў перайменаваны ў атрад імя М.А.Шчорса, які дзейнічаў на тэрыторыі Расонскага, Дрысенскага, Асвейскага раёнаў БССР, а таксама ў суседніх раёнах РСФСР і Латвійскай ССР.

Атрад разбілі на ўзводы, увялі воінскую дысцыпліну. Камандзірам атрада выбралі Пятра Машэрава, намеснікам — Сяргея Пятроўскага, начальнікам штаба — Пятра Гігелева. Яго брат — палітрук Мікалай Гігелеў — стаў камісарам атрада, а адказным за разведку стаў Воран (Валодзя Хамчаноўскі).

На рахунку партызан-шчорсаўцаў не адна баявая аперацыя. Асабліва дзёрзкай была аперацыя 2 мая 1942 года каля Клясціц. Засаду зрабілі днём. 14 смельчакоў літаральна зрашацілі варожую машыну, забралі важныя дакументы. У спісе людзей, якіх хацелі арыштаваць, значылася і прозвішча Машэрава. "Спазніліся шпікі", — толькі і ўсміхнуўся ён.

У тым баі Пётр Міронавіч атрымаў сур'ёзнае раненне. Акружалі карнікі, і ён прыняў рызыкоўнае рашэнне: паўзці не ў лес, а ў пасёлак, куды бліжэй і дзе можна хутчэй схавацца ад ворагаў. След удалося заблытаць. Сям'я палякаў Масальскіх, куды дакавыляў Пётр Машэраў, схавала і выхадзіла камандзіра партызанскага атрада імя Шчорса.

Потым зноў былі смелыя налёты народных мсціўцаў, засады пад носам у гітлераўцаў, магутныя ўзрывы на чыгунцы... У адным з баёў Машэраў атрымаў другое раненне. У суровы час ваеннага ліхалецця ў 1943 годзе ён стаў камуністам.

У тым жа годзе, у сакавіку, П.М.Машэрава назначылі камісарам партызанскай брыгады імя К.К.Ракасоўскага, якая летам 1943 года па рашэнні партыйных органаў і Беларускага штаба партызанскага руху перадыслацыравалася з Віцебскай у Вілейскую вобласць. Атрады, якія ўваходзілі ў брыгаду, удзельнічалі ў штурме варожага гарнізона ў вёсцы Кохановічы Асвейскага раёна, вялі абарончыя баі з карнікамі ў Асвейскім і Расонскім раёнах. У чэрвені 1943 года брыгада здзейсніла баявы марш з Расонскага ў Пастаўскі раён, падчас якога вялі баі з ворагам пры пераходзе праз чыгунку Полацк — Дрыса і фарсіраванні Заходняй Дзвіны, напала на гарнізон у Мёрах.

Хочацца нагадаць аб адной цікавай дэталі. Летам 1944 года камандаванне брыгады і падпольны абкам партыі прадстаўлялі Машэрава да ўзнагароджання ордэнам Леніна. Але начальнік Беларускага штаба партызанскага руху П.З.Калінін, азнаёміўшыся з баявымі заслугамі Пятра Міронавіча, "падняў вышэй" і напісаў, што ён заслугоўвае звання Героя Савецкага Саюза. На гэтым дакуменце ніжэй стаіць кароткая рэзалюцыя першага сакратара ЦК Кампартыі Беларусі П.К.Панамарэнкі "Падтрымліваю". Калі рашэнне было прынята, з'явілася інфармацыя контрразведкі: герой, аказваецца, у пачатку вайны быў у палоне. Панамарэнка, папярэдне параіўшыся з Зімяніным, патэлефанаваў Цанаве, які адказаў, што справа Машэрава закрыта. Указ быў падпісаны 15 жніўня

Эмануіл Іофе. Настаўнік на чале ЦК

# На чале ЦК

## *дня нараджэння Пятра Машэрава*

1944 года. У ім гаварылася, што гэтага высокага звання Машэраў удастоены за геразім і адвагу, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

### На камсамольскай і партыйнае рабоце

У ліпені 1944 года Пётр Машэраў стаў першым сакратаром Маладзечанскага абкама камсамола, а праз два гады — з ліпеня 1946 года — сакратаром ЦК ЛКСМБ. Ужо ў кастрычніку 1947 года яго выбралі першым сакратаром Цэнтральнага Камітэта камсамола Беларусі, гэта значыць кіраўніком камсамола рэспублікі. Амаль сем гадоў Машэраў займаў гэтую пасаду і набыў за гэты час вялікую папулярнасць і аўтарытэт сярод моладзі Беларусі. У ліпені 1954 года Пётр Міронавіч быў выбраны другім сакратаром Мінскага абкама партыі, а праз год — у жніўні 1955 года — першым сакратаром Брэсцкага абкама партыі. З красавіка 1959 года Пётр Машэраў працуе сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі, а са снежня 1962 года — другім сакратаром Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.

Гэта быў самы апошні перыяд яго адносна нядоўгага жыцця — з сакавіка 1965 года да пачатку кастрычніка 1980 года, перыяд, калі Пётр Машэраў быў першым сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі. Апошніх пятнаццаць з паловай гадоў з шасцідзесяці двух. Роўна чвэрць яго жыцця.

Тытанічная праца першага сакратара ЦК КПБ па кіраўніцтве нашай рэспублікай прыносіла адчувальныя вынікі. У 1979 годзе ўдзельная вага БССР у агульнасаюзнай вытворчасці мінеральных угнаенняў складала 12,4%, металарэжучых станкоў — 14,1%, трактароў — 15,4%, грузавых аўтамабіляў — 5,2%, падшыпнікаў — 13,9%, ільняных тканін — 10,7%, наручных гадзіннікаў — 12,6%, тэлевізараў — 7,6%, матацыклаў — 22,3%.

Адной з галоўных праблем, якія пастаянна хвалявалі Пятра Міронавіча, было развіццё сельскай гаспадаркі. Яго пастаянна бачылі ў калгасах і саўгасах, у меліяратыўных арганізацыях і на выпрабавальных станцыях. Па ініцыятыве Машэрава значныя змены адбыліся ў сельскай гаспадарцы рэспублікі. У другой палове 60-х гадоў ураджайнасць зерневых паднялася з 11,5 цэнтнера да 16 цэнтнераў з гектара, а іх валавы збор вырас на 900 тысяч тон. У калгасах і саўгасах стала больш буйной рагатай жывёлы.

Выкарыстанне дзяржаўных сродкаў дазволіла калгасам і саўгасам набываць значную колькасць тэхнікі, павышаць узровень механізацыі працы. Значна выраслі энергетычныя магутнасці сельскагаспадарчай вытворчасці. Праводзіліся мерапрыемствы па спецыялізацыі, меліярацыі і хімізацыі сельскай гаспадаркі. Плошча асушаных сельскагаспадарчых угоддзяў у рэспубліцы дасягнула 2,5 мільёна гектараў. На меліяраваных землях вырошчвалася 30% прадукцыі раслінаводства.

Машэраў любіў рэспубліканскія семінары па розных праблемах народнай гаспадаркі — у Саюзе яны не практыкаваліся, а ў рэспубліцы давалі добры вынік, натхнялі дзейнічаць. Кожны ўдзельнік такога семінара меў магчымасць і сябе паказаць, і на іншых паглядзець. Ён вяртаўся дадому і закасваў рукавы, будучы ўпэўненым, што новае прыжывецца і абавязкова атрымаецца.

Яшчэ ў 70-я гады Машэраў падняў пытанне аб замене адміністрацыйных ці, як ён казаў, "тэлефонных" метадаў кіраўніцтва эканамічнымі. Ён прапаноўваў карэнным чынам змяніць сістэму навучання і выхавання, паклаўшы ў яе аснову працу. Пятра Міронавіча вабіла навукаёмістая вытворчасць. Менавіта Машэраў літаральна прымусіў выключыць з практыкі ўсё старое насенне зерневых і прапашных культур і замяніць іх новымі, высокаўраджайнымі. Можна сказаць, што стыхіяй яго жыцця былі пошук і наватарства па многіх пытаннях.

Разам са станоўчымі якасцямі ў характары Пятра Міронавіча, як і ў кожнага чалавека, былі і адмоўныя, назіраліся пралікі ў гаспадарчай дзейнасці, у нацыянальнай палітыцы.

Цікавую, у нейкай ступені арыгінальную ацэнку пралікаў дзейнасці Машэрава даў адказны партыйны работнік пісьменнік Алесь Петрашкевіч: "Аб гэтым неардынарным чалавеку напісана шмат. Але праўдзівы вобраз яго, як мне здаецца, не раскрыты. Больш за тое, фантазіі адных стварылі з яго амаль свягога ад улады. Для іншых ён бясспрэчны манумент савецка-бальшавіцкага рыцара без страху і папроку. Між тым Машэраў быў складанай, неадназначнай, нават трагічнай фігурай. І — звычайным чалавекам, які па волі лёсу апынуўся ў абставінах, калі не толькі гісторыя робіць асобу, але і асоба гісторыю.

Ці быў ён шчаслівы? Сумняваюся. На такіх уладных вышынях шчаслівымі могуць быць толькі людзі, не абцяжараныя высокім інтэлектам...

Лёс мой склаўся так, што я меў магчымасць больш як 20 гадоў назіраць за Пятром Міронавічам, прытым гадоў 13 з іх не збоку, а, як кажуць, непасрэдна...

Я бачыў, якім шчаслівым быў Пётр Міронавіч, калі атрымаў ад "цэнтра" велізарныя, як тады здавалася, грошы на так званае "пераўтварэнне Палесся", а дакладней — на яго асушэнне. Якім разгубленым і раздражнёным ён быў, калі невялікая група пісьменнікаў і вучоных выступіла супраць татальнай меліярацыі. Ён не разумеў, як гэта адукаваныя, інтэлігентныя людзі не могуць зразумець і прыняць таго шчасця, якое ён нясе людзям вечна забітага Палесся, якое вякамі гніе ў балоце. Ён быў сканфужаны, абураны і разгневаны на псеўданавуку і вучоных-меліяратараў, калі зразумеў, што цэламу краю, яго прыродзе нанесена непапраўная шкода, не атрымалася таго эфекту, на які разлічвалі. А скалечанай аказалася не толькі прырода, але і ўклад жыцця палешукоў. Іх традыцыйная культура, іх мараль...

Другім расчараваннем і смуткам быў крах яго рамантычнай ідэі суцэльнага і хуткага перабудавання вёскі ў маштабах усёй рэспублікі. З 33 тысяч населеных пунктаў Беларусі больш як 30 тысяч былі аб'яўлены неперспектыўнымі, а прыкладна 2500—2700 павінны былі пераўтварыцца ў аграгарадкі з добрымі ўмовамі існавання...

Праз 10 гадоў такога неперспектыўнага жыцця вёскі апусцелі і зеўраюць сёння чорнымі дзіркамі гнілых аконных праёмаў".

Што тычыцца меліярацыі, то яна нярэдка праводзілася некампетэнтна, не ўлічваліся патрабаванні аховы навакольнага асяроддзя, што вяло да абвастрэння экалагічных праблем.

Між іншым сам Машэраў горка перажываў, што ў засуху на Палессі няма вады, што "тэарэтыкі і практыкі" загубілі цэлы край, а з Нямігі ўжо не аднавіць, як у Варшаве, Стара Мяста.

Многія вучоныя і архітэктары, якія сёння крытыкуюць дзейнасць Машэрава, забылі, як яны самі насіліся з ідэямі, абстаўлялі з помпай свае лжэпраекты, тоўпіліся ў кабінеце Машэрава і іншых сакратароў ЦК КПБ. Машэраў перш за ўсё быў кіраўнік, які прывык давяраць спецыялістам. І як чалавек захоплены, рамантык у душы, іншы раз занадта давяраў гэтым вучоным і архітэктарам і нярэдка паддаваўся заманлівасці той ці іншай ідэі.

Пётр Міронавіч удзяляў асаблівую ўвагу пад'ёму і росквіту навукі і культуры Беларусі. У прыватнасці, ён значна садзейнічаў інтэграцыі навукі з вытворчасцю. Пры інстытутах АН БССР, вышэйшых навучальных установах развівалася доследна-эксперыментальная база. У БССР пачалі ствараццa навукова-вытворчыя аб'яднанні.

Дзецішчам Машэрава ў нас у Беларусі называюць цяпер сусветна вядомы мемарыяльна-архітэктурны комплекс "Хатынь", які быў адкрыты ў 1969 годзе.

Пётр Міронавіч не адразу "дабіўся" Указа аб прысваенні Мінску звання "Горада-героя". Найбольш паслядоўнае супраціўленне аказваў Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, член Палітбюро ЦК КПСС М.Падгорны. Сцвярджаюць, што Машэраў усклікнуў нават: "Не хочуць яны, каб наш Мінск зраўняўся з іх Кіевам".

Шасцісерыйны тэлефільм "Руіны страляюць ва ўпор" па дакументальнай аповесці ўласнага карэспандэнта "Праўды" па Беларусі І.Новікава рабіўся з яўным прыцэлам на тое, каб прабіць тую сцяну непрызнання геразіму мінчан з боку некаторых членаў Палітбюро і дабіцца прысваення Мінску звання "Горада-героя". І кіраўнікі ЦК КПБ арыентавалі стваральнікаў фільма на гэта. Заказаў фільм кінастудыі "Беларусьфільм" Дзяржаўны Камітэт СССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Фільм быў зроблены ў 1971 годзе.

М.Падгорны запатрабаваў, каб Камітэт па тэлебачанні і радыёвяшчанні даставіў яму фільм на дачу. Паглядзеў і моўчкі вярнуў — ніякай ацэнкі. Занадта асцярожны старшыня Камітэта С.Лапін, не атрымаўшы ўказання начальства, пускаць фільм на тэлеэкран не адважыўся, паклаў яго на паліцу. Амаль на тры гады. І ўсе хадайніцтвы аб прысваенні гораду высокага звання натыкаліся на тую ж перашкоду — М.Падгорнага.

У гутарцы з аўтарам гэтых радкоў І.Новікаў узгадаў, як Пётр Міронавіч расказаў яму аб далейшым развіцці падзей. Пасля пасяджэння Палітбюро ЦК КПСС П.Машэраў звярнуўся да Л.Брэжнева:

"Леанід Ільіч, беларускія кінематаграфісты зрабілі вельмі цікавы дакументальна-ігравы тэлефільм аб мінскім падполлі... Паглядзіце, калі ласка. Не пашкадуеце, што патрацілі час".

Брэжнеў прапанаваў членам Палітбюро: "Давайце заўтра паглядзім разам".

Пасля прагляду Пётр Міронавіч устаў і зноў звярнуўся да Брэжнева:

"Леанід Ільіч, у вас даўно ляжыць праект указа аб прысваенні Мінску звання "Горада-героя". Падтрымайце, калі ласка".

Генсек спытаў у членаў Палітбюро: "Пярэчанні ёсць?". Усе маўчалі. Нават Падгорны як вады ў рот набраў. "Тады будзем лічыць, што рашэнне прынята", — сказаў Брэжнеў і пацiснуў руку Машэраву. І адразу дадаў: "Дамовіліся: указ будзе абнародаваны напярэдадні 30-годдзя вызвалення Мінска ад фашыстаў".

З іменем Машэрава звязана стварэнне мемарыяльнага комплексу "Брэсцкая крэпасць-герой" у 1969—1971 гадах на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці; адкрыццё ў 1969 годзе Кургана Славы Савецкай Арміі — вызваліцельніцы Беларусі — помніка ў гонар подзвігу воінаў 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх і 1-га Прыбалтыйскага франтоў у Беларускай аперацыі 1944 года, узведзенага на 21-м кіламетры шашы Мінск—Масква; мемарыяльнага комплексу "Прарыў" у гонар прарыву варожай блакады партызанамі 5 мая 1944 года ў ходзе Полацка-Лепельскай бітвы 1944 года, створанага ў 1974 годзе на месцы баёў паміж вёскамі Паперына, Пліна і Новае Сяло, за 7 кіламетраў ад гарадскога пасёлка Ушачы.

І яшчэ крыху аб супярэчлівасці асобы Машэрава. Народны пісьменнік Беларусі, член ЦК КПБ, старшыня Вярхоўнага Савета БССР Іван Шамякін, які шмат разоў сустракаўся з Пятром Машэравым, у сваіх успамінах адзначаў: "Многа добрага зрабіў гэты чалавек і для эканомікі, і для культуры. Але... але нялёгка пісаць пра яго, таму што асабіста і да гэтага часу не магу растлумачыць палітычна, філасофскі гэтую страшэнную супярэчнасць. Адкуль яна ў даволі разумнага чалавека? Ад ідэалагічнай зацыкленасці? Зацыкленымі мы былі, бадай, усе, але не ў такой жа меры. Усе разумелі ненармальнасць палітыкі, якая праводзілася. Разумеў жа Машэраў, што без культуры не будзе нацыі, стараўся дапамагчы ёй. А ў імя чаго? Дзеля чаго? Дзеля справаздачы? Знікала ж мова народа — аснова нацыянальнай культуры. Гэтыя пытанні мы ставілі і тады, гэты боль абпальваў, і мы крычалі. Гаварылі і Машэраву, і ён быццам пагаджаўся. Але русіфікацыя не спынялася, яна ішла гэтак жа інтэнсіўна, як пры Гусараве (дык ён жа рускі), пры Мазураве; нават Панамарэнка не дазваляў такіх паваротаў, калі газеты заходніх абласцей, раёнаў, "Сельская газета" перакладаліся на рускую мову. Працэс гэты не быў стыхійным. Ён заахвочваўся пры сарамлівым маўчанні многіх. Беларускі настаўнік, які добра ведае родную мову (паэму "Сказ пра Лысую гару" чытаў на памяць з цудоўным вымаўленнем"), Машэраў ні разу — ні на адным пленуме, нарадзе, з'ездзе, сесіі, урачыстым пасяджэнні — не выступіў па-беларуску. І ў прыватнай размове з намі, пісьменнікамі, не карыстаўся ёю. Т.Я.Кісялёў з Броўкам, Танкам, са мной, з іншымі пісьменнікамі гаварыў на роднай мове. А Машэраў як бы дэманстраваў сваю рускасць. І гэта дзейнічала хутчэй, чым любыя пастановы, — такі прыклад першай асобы ў рэспубліцы. Акрамя нас, пісьменнікаў, ніхто не выступаў па-беларуску — ні адзін ідэолаг усіх рангаў — ад ЦК да райкамаў, ні міністр культуры, ні нават нашы калегі з творчых саюзаў. Выключэннем на рэспубліканскім узроўні быў адзін міністр асветы Міхаіл Гаўрылавіч Мінкевіч, светлая яму памяць. Усё гэта сапраўды цяжка растлумачыць. Такая была ўпэўненасць, што ў хуткім часе, пры блізкім камунізме, нацыі з'яднаюцца і мовы адамруць? Няўжо была? Ці быў моцны ціск з Крамля: "Ніякіх уступак нацыяналізму!"? Аднак у іншых рэспубліках працэс так не фарсіраваўся...".

Трэба адзначыць, што побач з хворымі, нямоглымі і тымі, хто спаў на адказных пасяджэннях, членамі Палітбюро ЦК Кампартыі Савецкага Саюза Машэраў выглядаў недаравальна маладым. Калі Брэжнеў у 1978 годзе з вялікім спазненнем уручаў яму Зорку Героя Сацыялістычнай Працы, ён груба абарваў Машэрава, калі той выступаў з прамовай у адказ.

Пройдзе два гады, і на пахаванне Пятра Міронавіча Брэжнеў прышле менавіта сакратара ЦК КПСС Зімяніна, цудоўна ведаючы, што ў Машэрава з ім былі халаднаватыя адносіны.

Леаніда Брэжнева насцярожыў яшчэ адзін факт. Адзін уплывовы часопіс правёў апытанне сярод амерыканскіх кангрэсменаў напярэдадні выбараў у прэзідэнты: хто з замежных лідараў мог бы стаць прэзідэнтам ЗША, каго бачаць яны на месцы Брэжнева?

Многія адказалі нечакана: Машэрава. Крэмль гэтая інфармацыя насцярожыла, аб ёй ведалі толькі ў ТАСС, але ад газет і радыё гэтую інфармацыю ўтоілі. Ёсць падставы лічыць, што такую папулярнасць у амерыканцаў Пётр Міронавіч набыў пасля візіту на Кубу і паспяховых перагавораў з Фідэлем Кастра.

### У сям'і

У адрозненне ад многіх кіраўнікоў нашай рэспублікі, ён быў прыгожым як знешне, так і сваёй чалавечай сутнасцю.

Адной з выдатных рыс характару Машэрава было чалавекалюбства, гуманізм. Ужо будучы першым сакратаром ЦК КПБ ён пакіне ў дзённіку такі запіс: "Я вельмі люблю людзей. Захапляюся людзьмі. Што самае цудоўнае, што самае моцнае, што з'яўляецца нашым багаццем, нашым дасягненнем, дык гэта нашы людзі. Душы іх адгукаюцца на ўсе справы, на ўсе нягоды".

Дачка П.М.Машэрава Наталля Пятроўна ўспамінае: "Бацька быў бясконца сціплым у сваіх асабістых запытах і патрабаваў гэтага ад нас, яго дзяцей, яго сям'і. Мы ўсе ведалі, што звяртацца да таты з просьбамі, якія ён можа вырашыць толькі дадзенай яму ўладай, немагчыма і марна. Патрабавальнасць да сябе станавілася маральнай мерай для нас, яго дзяцей.

...І мы, на шчасце, паспелі ўключыць толькі што падораны дыктафон і запісаць яго роздумы аб сутнасці дабрыні камуніста, надзеленага ўладай кіраўніка:

— Калі хтосьці паводзіць сябе сумленна толькі па знешніх (пасада патрабуе) прычынах, а не па ўнутраных матывах, то немінуча зруйнуецца яго аўтарытэт. Самаадданасць у працы і сціпласць у жыцці, дзейсная дабрыня і дэмакратычнасць — вось нормы існавання чалавека. Гэта фундамент, на якім выяўляюцца таленты і здольнасці кожнага. Жыццё ў імя іншых, не быць рабом грошай, захаваць свабоду думак і высокіх ідэйных перакананняў, дзеля якіх варта жыць і працаваць...

Можна прывесці шмат прыкладаў, якія пацвярджаюць тую ісціну, што Пётр Машэраў быў адданым сынам, мужам і бацькам.

У грозныя гады вайны, 9 верасня 1942 года, ад рук гестапаўцаў загінула маці Пятра Міронавіча — Дар'я Пятроўна. Сын да канца жыцця адчуваў сябе вінаватым, што не выратаваў маці, лічыў, што яна загінула праз яго. Будучы першым сакратаром ЦК, пралятаючы над Віцебшчынай, Машэраў заўсёды адзначаў на карце два пункты, дзе абавязкова трэба было прызямліцца. Першым з іх была магіла маці. Ён моўчкі ўваходзіў на простыя вясковыя могілкі. Пётр Міронавіч стаяў, схіліўшы галаву. Ён гладзіў рукамі надмагілле і ціха шаптаў: "Даруй". Яму здавалася, што мацярынскае сэрца працягвае біцца ў яго ўласных грудзях, што маці яго чуе і разумее".

Пётр Міронавіч Машэраў трагічна загінуў у аўтакатастрофе 4 кастрычніка 1980 года на 63-м годзе жыцця. Ён пахаваны на Усходніх могілках у Мінску. У Віцебску ўстаноўлены помнік Машэраву. Яго імем названы вуліцы ў многіх населеных пунктах Беларусі, у тым ліку ў Мінску, Віцебскі дзяржаўны універсітэт, розныя ўстановы і арганізацыі нашай рэспублікі.

**Эмануіл ІОФЕ,**
**доктар гістарычных навук, прафесар кафедры паліталогіі і права БДПУ імя МаксімаТанка.**